БЕЛАРУСКАЯ МОВА

7

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**АФАРЫ́ЗМ** (грэч. *aphorismós* «выслоўе», «вызначэнне»), аўтарскае выказванне, якое передае лагічна закончаную думку (суджэнне) — жыццёвае назіранне, заклік, разважанне, параду, выражаную ў дасканалай, лаканічнай форме: *Без чалавечнасці не будзе вечнасці* (П. Панчанка); *Паэзія — хлеб душы* (П. Макаль); *Калі відзён ужо канец дарогі, ты сам сабе — суддзя і пракурор* (С. Грахоўскі).

Уключае ў сябе 2 планы, якія знаходзяцца ў цесным адзінстве: мудрае выслоўе (план зместу) і выслоўе, выказанае ў дасканалай, лаканічнай форме (план выражэння).

Вылучаюць 2 тыпы А.: моўныя (рэгулярна ўзнаўляюцца і зразумелыя без тэксту літаратурнага твора, адкуль яны ўзяты), маўленчыя (як правіла, індывідуальна-аўтарскія, іх вобразнасць, афарыстычнасць выяўляецца непасрэдна з кантэксту, са зместу самога літаратурнага твора).

Сукупнасць выслоўяў, А. пэўнага часу, народа, фальклорнага ці літаратурнага паходжання называецца *афарыстыкай*: беларуская афарыстыка, вуснапаэтычная афарыстыка. Гэтым жа тэрмінам абазначаецца і філалагічная дысцыпліна, якая вывучае выслоўі, афарызмы.

Да А. набліжаюцца крылатыя словы.

Тэрмінаспалучэнне *«крылатыя словы»* паводле паходжання само з'яўляецца крылатым выразам: прыйшло да нас з глыбокай старажытнасці. Гэты выраз сустракаецца ў паэмах «Іліяда» і «Адысея» Гамера.

З часам паняцце *«крылатыя словы»* стала тэрмінам мовазнаўства і літаратурнай стылістыкі, дзе ён абазначае вобразныя выказванні пісьменнікаў, вучоных, грамадскіх дзеячаў, цытаты з літаратурных крыніц, якія атрымалі шырокае распаўсюджванне, сталі агульнавядомымі: *Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш* (Я. Колас).

Да крылатых выразаў таксама адносяцца імёны міфалагічных і літаратурных персанажаў: *Крэз*, *Абломаў*, *Гарлахвацкі*; трапныя найменні: *бруднае качаня*, *тутэйшыя*, *свінтус-грандыёзус*; заклікі, звароты, загады: *Каня! Каня! Паўцарства за каня!*, *Каханенькая, родненькая!*; агульнавядомыя перыфразы: *карычневая чума* (фашызм), *другі хлеб* (бульба).

Крылатыя словы, якія з'яўляюцца складовым кампанентам пэўнай нацыянальнай культуры, уключаюць не толькі выразы з адной мовы. Так, у беларускім моўным ужытку сустракаюцца адзінкі такога кшталту і з іншых літаратур, філасофскіх твораў, навуковых прац, Бібліі і г.д. Ёсць і такія крылатыя словы, што ўвайшлі ў беларускую ідыяматыку ў першапачатковай моўнай форме: *ничтоже сумняшеся* — са стараславянскай, *cherchez la femme* — з французскай, *finita la comedia* — з італьянскай моў.

Крылатыя выслоўі выкарыстоўваюцца не як цытаты, а як звычайныя ўстойлівыя звароты. Яны характарызуюцца лаканічнасцю, выразнасцю і вобразнасцю.

*Н.М. Нямковіч*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ